(47 60)
С 76

Смерць нямецкім акупантам!

Стальнову В.

# Нічога не забудзем, нічога не даруем

Выдавецтва ЦК КП(б)Б
„Совецкая беларусь".
1943

9(47.60)
С 76

*Смерць нямецкім акупантам!*

# НІЧОГА НЕ ЗАБУДЗЕМ, НІЧОГА НЕ ДАРУЕМ

## ДАКУМЕНТЫ АБ ЗВЕРСТВАХ НЯМЕЦКІХ АКУПАНТАЎ НА БЕЛАРУСІ

*ЗБОРНІК № 1*

СКЛАЎ В. СТАЛЬНОЎ

333342
15274
Чытальны зал Урадавай бібліятэкі імя А. М. Горкага
Ф. М.
Дзяржаўная Бібліятэка імя А. М. Горкага
3 28/XI 51

Выдавецтва ЦК КП(б)Б
«Совецкая Беларусь»
1943

## НІЧОГА НЕ ЗАБУДЗЕМ, НІЧОГА НЕ ДАРУЕМ

Нямецка-фашысцкія акупанты свае гнусныя планы грабяжу, тэрору і знішчэння народа пачалі праводзіць у жыццё з першай гадзіны ўступлення на совецкую зямлю.

Ужо 22 чэрвеня 1941 года наша краіна пачула стогны жанчын, старых і дзяцей Ломжынскага, Аўгустоўскага і іншых пагранічных раёнаў Беларусі. Масавыя забойствы ні ў чым нявінных людзей немцы ўчынілі ў Брэсце, Бельску, Саколках, ва ўсіх акупіраваных гарадах і раёнах Беларускай ССР.

У Мінску фашысты павесілі і расстралялі больш 100 тысяч мірных жыхароў, у Магілеве—больш 14 тысяч чалавек, у Пінску—10 тысяч, у Барысаве—10 тысяч, у Віцебску—звыш 25 тысяч.

Нямецкія каты знішчаюць жанчын, старых і дзяцей, яны паляць іх жывымі, кідаюць у калодзежы.

Гітлераўцы планамерна змятаюць з твару зямлі гарады і сёлы Беларусі. Поўнасцю спалены і разбураны Гомель, Рагачоў, Шклоў, Тураў, Петрыкаў. У Мінску знішчана 85 проц. будынкаў. Цэлыя кварталы і раёны перасталі існаваць у Гродні, Лідзе, Ваўкавыску, Баранавічах, Віцебску, Магілеве, Оршы, Полацку і г. д.

Мы выпускаем першы зборнік «Дакументаў аб зверствах нямецкіх акупантаў у Беларусі». У ім змешчаны фота-дакументы, акты, пісьмы і апавяданні сведак грабяжоў і зверстваў, якія чыняць нямецкія акупанты на Беларусі.

Кроў стыне ў жылах, калі чытаеш гэтыя дакументы. Гневам напаўняецца сэрца, калі глядзіш на фотаздымкі нямецкіх бясчынстваў, калі чытаеш «дырэктывы» сучасных людаедаў. Свет яшчэ не ведаў і не чуў гэтакіх жахлівых злачынстваў!



Бібліятэка ... ССР ... Уральская

Народы Совецкага Саюза ніколі не забудуць і не даруюць гітлераўскім людаедам іх зверстваў у часова акупіраваных імі совецкіх раёнах, абласцях і рэспубліках. Нямецка-фашысцкія злачынцы не ўцякуць ад адказнасці і адплаты за слёзы і пакуты, за кроў і мучэнні совецкіх грамадзян!



Так выглядае нямецка-фашысцкі «новы парадак» на Беларусі.
На здымку: павешаныя немцамі рабочыя дэпо ст. Орша.

Набліжаецца час расплаты. Недалёка той дзень, калі наша слаўная Чырвоная Армія пад геніяльным кіраўніцтвам правадыра, Маршала Совецкага Саюза таварыша І. В. Сталіна вызваліць совецкую зямлю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Беларускі народ ужо чуе магутныя раскаты совецкай артылерыі, усё часцей і часцей чуецца ўпэўненае партызанскае «ура».

Смерць нямецкім акупантам!



Цэнтральная частка Мінска, разбураная немцамі.

I

## МАСАВАЕ ЗНІШЧЭННЕ МІРНАГА СОВЕЦКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА

(Вытрымкі з Нотаў Народнага Камісара Замежных Спраў тав. В. М. Молатава ад 25 лістапада 1941 г., 6 студзеня 1942 г. і 27 красавіка 1942 г.)

У раёне горада Барысава, Беларускай ССР, захапіўшы ў палон 70 цяжка параненых чырвонаармейцаў, гітлераўцы ўсіх іх атруцілі мыш'яком.

*

Палонных чырвонаармейцаў мораць голадам, па тыднях не даючы есці ці выдаючы мізэрныя порцыі гнілога хлеба або гнілой бульбы. Не даючы совецкім ваеннапалонным есці, гітлераўцы прымушаюць іх рыцца ў памыйках і шукаць там адкідаў, выкінутых германскімі салдатамі, або, як гэта мела месца ў радзе лагераў, у тым ліку і ў лагеры м. Карма, Беларускай ССР, кідаюць совецкім ваеннапалонным за калючы дрот трупы дохлых коней. У Віцебскім лагеры ў Беларусі палонныя чырвонаармейцы 4 месяцы амаль не атрымоўвалі яды. Калі група палонных чырвонаармейцаў падала нямецкаму камандаванню пісьмовую заяву з просьбай выдаць ім яду для падтрымкі жыцця, нямецкі афіцэр запытаў — хто пісаў гэтую заяву—і 5 чалавек чырвонаармейцаў, якія пацвердзілі, што гэту заяву пісалі яны,—тут-жа былі расстраляны.

*

На Беларусі, каля гор. Барысава, у рукі гітлераўцаў трапілі 75 жанчын і дзяўчат, якія хацелі ўцячы пры набліжэнні нямецкіх войск. Немцы згвалцілі, а потым па-зверску забілі 36 жанчын і дзяўчат. 16-гадовую дзяўчыну Л. І. Мельчукову па загаду нямецкага афіцэра Гумера салдаты завялі ў лес, дзе згвалцілі. Праз некаторы час, іншыя жанчыны, таксама адведзеныя ў лес, убачылі, што каля дрэў стаяць дошкі, а да дошак штыкамі прыколата паміраючая Мельчукова, у якой немцы на вачах іншых жанчын, у прыватнасці В. І. Альперэнка і В. М. Бярэзнікавай, адрэзалі грудзі.

*

28 жніўня 1941 года пры пераправе праз раку Іпуць нямецка-фашысцкія войскі, якія бяссільны былі перамагчы стойкае супраціўленне часцей Чырвонай Арміі, сабралі мясцовае насельніцтва беларускага горада Добруш, Гомельскай вобласці, і пад страхам расстрэлу пагналі наперадзе сябе жанчын, дзяцей і старых, за якімі, адкрываючы свае баявыя парадкі, пайшлі ў наступленне.

*

На Беларусі акупантамі разгромлены і разграблены Беларуская Акадэмія Навук з самай рэдкай калекцыяй гістарычных дакументаў і кніг, Горацкая Сельскагаспадарчая Акадэмія, якая нядаўна святкавала сваё стагоддзе, знішчаны сотні школ, клубаў, дзесяткі тэатраў, музычныя ўстановы і самыя рэдкія ўзоры народнай творчасці.

*

У беларускай вёсцы Халмы, Магілеўскай віласці, гітлераўцы схапілі 6 дзяўчат ва ўзросце ад 15 да 17 год, згвалцілі іх, выразалі грудзі, выкалалі вочы і забілі. Адну маладую дзяўчыну — калгасніцу Аксёнаву прывязалі за ногі да верхавін нахіленых дрэў і разарвалі.

*

Пры разгроме часцямі Чырвонай Арміі ў раёне г. Тарапца ў студзені 1942 года кавалерыйскай нямецкай брыгады «СС» сярод захопленых дакументаў знойдзена справаздача 1 кавалерыйскага палка названай брыгады аб «уміратварэнні» ім Старобінскага раёна на Беларусі. Камандзір палка дакладвае, што разам з 239 палоннымі, атрадамі яго палка расстраляна 6.504 мірных жыхары, прычым у справаздачы ўказваецца, што атрад дзейнічаў на падставе загада па палку за № 42 ад 27-га ліпеня 1941 года.

## ЛІСТ МУЖУ

(З гор. Віцебска)

Ты просіш расказаць пра бацьку. Я з ім сустракалася шмат разоў, але дапамагчы яму не магла, бо сама жыла не лепш. Жылі яны ў развалінах дому. Аднаго разу ён прыйшоў да мяне. Выглядаў ён жахліва, апухлы, абадраны (у іх усё адабралі). Апошняе спатканне з ім не адбылося—мы павінны былі сустрэцца ў нядзелю, а ў суботу яго расстралялі. Мая мама засталася ў Віцебску. Я была тры разы ў Сцяпана, дзякуй яму—ён пашыў Аліку буркі. Дзе ён цяпер, не ведаю. 16 лютага пасёлку далі дзве гадзіны тэрміну—вызваліць усе будынкі. Потым немцы ўсіх расстралялі. Многія нашы сябры, якія засталіся, загінулі: зубны ўрач Лукарэвіч, доктар Марковіч, сёстры нашы, маладыя акушэркі, усіх не пералічыш. Усе яны загінулі пасля жахлівага жыцця, многія памерлі з голаду яшчэ да расстрэлу. Расстрэльвалі на Тулаўскай, за новай больніцай. Былі выкапаны вялікія ямы. Прывозілі на аўтамашынах, ставілі перад ямай і загадвалі распранупца. Потым страчылі з кулямёта. Каго забівалі адразу, хто падаў у няпрытомнасці, каго ранілі — усіх адразу-ж скідвалі ў яму.

Тыя, што бачылі, расказвалі, што там зямля тры дні стагнала. Засыпалі ледзь-ледзь, нават ногі былі відаць. Вось табе скарочана аб лёсе шасці тысяч няшчасных. Горад увесь згарэў, за выключэннем адной часці Ленінскай. У садзіку перад каланчой—шыбеніца, там кожны тыдзень вешаюць па некалькі чалавек. Страшэнны малюнак.

За галаву нашага сына Аляксандра (ён партызан) немцы абяцалі 12 тысяч рублёў. Аднойчы яго вялі разам з іншымі партызанамі на расстрэл, вялі па марозе голымі, босымі. Самі немцы сядзелі на конях, а рук партызанам не звязалі. Давялі іх да яру, а яны, змовіўшыся, кінуліся ў лес і выратаваліся.

Вось, мой дарагі, колькі мы перажылі жахлівых дзён. Алік цябе ні на дзень не забывае, ён усё разумее. Бывала, у дні бязвыходнага гора, ён абніме мяне і гаворыць: «Мама, давай абнімемся і ўтопімся». А потым тут-жа спахопіцца і кажа: «Не, мама, нельга—раптам тата прыдзе, а нас няма?»

**Захарава,**
жонка байца
Чырвонай Арміі.

## ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ АД СОВЕЦКАЙ ГРАМАДЗЯНКІ, ЯКАЯ ВЫРВАЛАСЯ З ВАРОЖАГА ПАЛОНУ

Паважаны таварыш рэдактар! Прашу Вас, калі знойдзеце магчымым, змясціце мой ліст у газеце, каб усе ведалі нямецка-фашысцкую подласць. Нядаўна нас вызвалілі партызаны, вырвалі з пасткі лютых фашысцкіх сабак. Увесь жах нашага цяжкага палону ў нас яшчэ на вачах, не можам заснуць. Мне здаецца, гэтага нельга перажыць, калі не падзяліцца з людзьмі. Няхай знае ўвесь совецкі народ, усе байцы і камандзіры і мае браты комсамольцы Пётр і Уладзімір Крашэўскія, якія знаходзяцца зараз на фронце, што чыняць у Беларусі немцы.

Мы адзінаццаць месяцаў пакутвалі ў нямецкім ярме. Хаваліся з дзецьмі ў лясах і балотах. У мінулым годзе, у дзень Кастрычніцкай рэволюцыі, мы ў сваім пасёлку пасля ад'езду карнага атраду знялі 18 чалавек павешаных і прыбралі забітых і спаленых сваіх суседзяў, якія не паспелі схавацца ў лесе, калі немцы акружылі пасёлак. Гэта было ў суботу і пятніцу. І вось так амаль кожны тыдзень на працягу ўсіх

гэтых адзінаццаці месяцаў наязджалі ў нашы месцы карныя атрады раз'юшаных псоў і знішчалі ўсіх, хто не паспеў схавацца.

Я са сваёй сям'ёй хавалася на балоце. Там вялікая крапіва. Мой двухгадовы хлопчык Вова заўсёды быў у вялікіх валдырах ад гэтай крапівы. Але калі ён чуў слова «немцы», ён заўсёды крычаў: «пабяжым у крапіву» і ніколі не плакаў. Аднаго разу каля гэтай крапівы, калі мы там ляжалі, хадзілі фашысты і паролі штыкамі, а мы ляжалі моўчкі. Мы ведалі: калі толькі хто паварушыцца, то немцы нас знойдуць і закатуюць.

Ніколі не забыць нам дзень 1 Мая, дарагі наш дзень. У гэты дзень немцы асабліва лютавалі.

У шэсць гадзін раніцы 1 Мая нямецка-фашысцкія бандыты спалілі і знішчылі ўсю вёску Молгаці. Яны спалілі ў агні ўсіх людзей, якія жылі ў гэтай вёсцы. Вырataваліся толькі два хлапчукі: яны ў гэты час лавілі на возеры рыбу і таму засталіся жывымі.

Вось вам яшчэ прыклад, якія лютыя і каварныя звяры немцы. Калі нямецкія самалёты абстрэльвалі пасёлак, яны скідвалі замініраваныя дзіцячыя цацкі. Яны разлічвалі, што дзеці будуць браць гэтыя цацкі і паўзрываюцца пры гэтым.

Цяжка нам было ў гэтыя дні першамайскіх свят, але ўсё-ж мы не падалі духам. І вось, адкуль не вазьміся, прылятае да нас савецкі самалёт з чырвонымі зоркамі і скідвае нам лістоўкі.

Як мне апісаць тое, што мы перажылі ў гэты момант? Мы лавілі лістоўкі, у якіх Радзіма віншавала нас са святам 1 Мая, чыталі іх і ад радасці плакалі. Мы зразумелі тут увачавідкі, што Радзіма і таварыш Сталін помняць аб нас і стараюцца нам дапамагчы.

Дарагія браты і сёстры! Ніколі не забыць і ніколі не апісаць усяго таго, што мы перажылі і наглядзеліся за гэтыя адзінаццаць месяцаў.

Дарагія беларускія партызаны і партызанкі! Мы ўсе душэўна вас дзякуем за тое, што вы вырвалі нас з пасткі нямецкага тыгра. Вы дапамаглі нам перайсці праз лінію фронта. Зараз мы знаходзімся ў глыбокім тыле. Але вы не думайце, дарагія таварышы, што мы не дапамагаем у вашай вялікай барацьбе. Хаця мы шмат перажылі і аслабелі ад мучэнняў, але мы зараз не хочам адпачываць. Адпачываць будзем пасля, калі вызвалім нашу родную Беларусь і разаб'ём немцаў. А зараз мы працуем і стараемся дапамагчы вам.

Вось што нясуць гітлераўцы беларускаму народу.




Перад Домам Чырвонай Арміі ў Мінску немцы пабудавалі шыбеніцы.



На здымку: савецкая жанчына, якая павешана немцамі ў мястэчку Мір, Баранавіцкай вобласці.

Яшчэ раз душэўна дзякуем вам за ўсё—і за тое, як перапраўлялі нас на руках цераз балота, і за тое, што саджалі ў вагоны, і за тое, як ратавалі ад бамбёжкі. Усяго гэтага мы ніколі не забудзем.

Вельмі прашу рэдакцыю надрукаваць гэты ліст.

**Лідзія Філіпава.**

## ЛІСТ ПАРТЫЗАНА

Дарагая сястра! Ты хочаш ведаць аб лёсе родных і знаёмых. Расказваю ўсё, што бачыў сваімі вачыма. Немцы спалілі 8 вёсак, расстралялі і жыўцом спалілі 1.500 ні ў чым нявінных жанчын, дзяцей, старых. Страшэнны лёс спасціг і нашу вёску.

У гэты дзень усе жыхары, як заўсёды, выйшлі ў поле. Але не паспелі яны ўзяцца за работу, як немцы абстралялі іх з кулямётаў. Большасць людзей засталася на полі забітымі.

Тых, якія засталіся ў жывых, немцы сталі заганяць у пасёлак, быццам на сход. Жанчын заперлі ў хату, а мужчын сагналі ў гумно. Пасля расставілі навокал кулямёты і падпалілі гумно. Мужчыны выламалі дзверы і кінуліся ўцякаць. Шмат хто з іх быў абпалены, адзежа на іх абгарэла. Немцы адкрылі кулямётную стральбу, знішчаючы ўцякаючых. Наш бацька загінуў. Васіль Несцяраў таксама забіты. Дзед згарэў у сваёй хаце. Наша маці таксама згарэла. Усяго ў нашай вёсцы загінула 136 чалавек.

Я ўцёк у лес і з таго часу знаходжуся ў радах народных мсціўцаў. Над магілай бацькі я пакляўся жорстка адпомсціць нямецкім разбойнікам.

**Партызан Сцяпан Н.**

## АКТ

9 студзеня 1943 года, вёска Чарневічы, Барысаўскага раёна, Мінскай вобласці.

Мы, ніжэйпадпісаныя, прадстаўнікі партызанскіх атрадаў імя Шчорса і «Большэвік» і жыхары вёскі Чарневічы Міхаіл І. і Елена І. склалі гэты акт аб наступным:

Нямецкія захопнікі ў названай вышэй вёсцы спалілі 105 хат і забілі 32 чалавекі мірных жыхароў. З іх: мужчын—14, жанчын і дзяцей—18; дзяцей ад 3 да 10 год—8 чалавек,

старыкоў ад 50 да 90 год—17 чалавек. 1 чалавек быў кінут жывым у калодзеж, 10 чалавек спалена, астатнія 21 чалавек расстраляны.

Акт падпісалі — прадстаўнікі партызанскіх атрадаў імя Шчорса і «Большэвік».

**Антон Г., Васіль У., Іван І., Васіль Л., Міхаіл І., Елена І.**

**Дадатак да акту**

## СПІС ПА-ЗВЕРСКУ ЗАКАТАВАНЫХ І ЗАБІТЫХ НЕМЦАМІ ЖЫХАРОЎ в. ЧАРНЕВІЧЫ

Клімашонак Сцяпан Халімонаў — 58 год, Клімашонак Аляксей—75 год, Клімашонак Арына—50 год, Клімашонак Пелагея—48 год, Чарняк Міхаіл Нікалаевіч—10 год, Чарняк Матруна—60 год, Куракевіч Кузьма Сяменавіч—55 год, Куракевіч Тэкля—50 год, Куракевіч Елена—30 год, Куракевіч Нэля—5 год, Гайдук Стэфан—80 год, Гайдук Сцяпан—8 год, Мазуркевіч Раман—60 год, Мазуркевіч Л.—60 год, Шастаковіч Арына—90 год, Дзегцяр Маланння—80 год, Чарняк Міхаіл—75 год, Чарняк Анна—35 год, Чалей Рая—10 год, Чалей Іна — 4 год, Гайдук Міхаіл — 60 год, Клімашонак Нікалай—40 год, Куракевіч Пётр—40 год, Ісаёнак Ксеня—60 год, Клімашонак Наум—70 год, Клімашонак Юлька—70 год, Клімашонак Маня—7 год, Грыгаркевіч Майсей—60 год, Чалей Грыгорый—45 год, Чалей З.—7 год, Мазуркевіч (дзяўчынка)—10 год, Чалей Ніна—6 год.

## АКТ

15 студзеня 1943 года, вёска Крушына, Барысаўскага раёна.

Мы, ніжэйпадпісаныя, партызан Н. Г. і калгаснік Ц. склалі гэты акт аб наступным:

7 студзеня 1943 г. нямецкім карным атрадам у вёсках Крушына і Гарэлы Астравок, Чарневіцкага сельсовета, Барысаўскага раёна, спалены ўсе будынкі, забрана маёмасць насельніцтва, забіты і спалены жывымі мірныя жыхары:

У вёсцы Крушына: калгаснік Іпаліт Юльянаў—40 год, яго жонка, калгасніца Ліда Антонава—37 год, іх сын Стась—12 год, іх сын Вінцэсь—6 год, іх дачка Валя—2 год, Цвырко

Марыя Іосіфаўна—56 год, яе дачка Елена Антонаўна—13 год, Фалькоўская Хрыстына Васільеўна—37 год, яе дачка Ніна Франкаўна—14 год, яе дачка Маня—12 год, яе сын Іван—8 год, яе сын Толя—5 год, сям'я Фалькоўскай Х. В., калгасніца Клімашонак Гілена Пятроўна—22 год, яе сын Клімашонак Васіль Стасевіч—4-месячнае дзіця.

У вёсцы Гарэлы Астравок: Шахно Стэфа Тодарава—37 год, яе сын Віця Язэпавіч—10 год, яе сын Бронька—7 год, дачка Ядзя—5 год, сын Пётр—2 год, нованароджанае 3-месячнае дзіця. Юшкевіч Надзя—26 год, Юшкевіч Галя Лявонаўна—2 год, Заяц Захар Сільвестравіч—65 год, Заяц Лёкса Данілаўна—62 год. 80-гадовы Ісаенак А. Ф., цяжка паранены, а пасля ранення памёр, спалена Л. Заяц.

**Аб чым і складзены гэты акт.**

**Следуюць подпісы.**

## АКТ

8 студзеня 1943 года, вёска Сыч, Барысаўскага раёна.

Мы, ніжэйпадпісаныя, прадстаўнікі партызанскага атрада «Комуніст» Васіль Д., Аляксей Ш., Леанід Г. і Міхаіл П. гэтага дня склалі акт аб зверствах, якія ўчынілі немцы і германская паліцыя над мірным насельніцтвам у памянёнай вышэй вёсцы. Намі ўстаноўлена, што гітлераўскія бандыты забілі і спалілі 52 чалавекі мірных жыхароў, у тым ліку мужчын—24, жанчын—12, дзяцей—16. Спалена таксама 65 хат.

Усе спаленыя і расстраляныя гітлераўцамі мірныя жыхары вёскі Сыч пахаваны прадстаўнікамі партызанскага атрада «Комуніст».

**Подпісы: Васіль Д., Аляксей Ш., Леанід Г., Міхаіл П.**

## АКТ

17 студзеня 1943 года, вёска Азяркі, Шаброўскага сельсовета, Суражскага раёна.

Мы, ніжэйпадпісаныя, прадстаўнікі партызанскага атрада Нікіфар С., палітработнік Надзежда І., медсястра Яўгенія Ш., баец Ягор Т. і грамадзяне вёскі Азяркі Шаброўскага сельсовета Яфім К., Марыя К. і Анна К. гэтага дня прысутнічалі на Задобрынскіх могілках, куды былі звезены трупы па-зверску закатаваных фашыстамі мірных совецкіх жыхароў—старых, жанчын і дзяцей з вёсак Задобрына, Азяркі і іншых. Намі ўстаноўлена, што гітлераўцы ў гэтых вёсках забівалі і палілі ўсіх жыхароў падрад.

У ліку загінуўшых — сям'я партызана Даніїла Х., яго жонка Марыя Патапаўна, сын Віктар—4 год, сын Валодзя—6 месяцаў, маці старая і цесць Патап Гаўрылавіч, а таксама Кардзецкі Мікола Архіпавіч—34 год, інвалід і Кардзецкага жонка Лідзія Сямёнаўна, іх сын Дзмітры—7 год, сын Валодзя—5 год і дачка Лідзія—3 год. Жывымі былі кінуты ў агонь 78-гадовы стары Васькоў Грыгорый Міхайлавіч, Клюеў Сілівон—57 год і яго сын Якаў Сямёнавіч—16 год. Забіты Казлоў Іван і Казлова Анастасія, тры сыны якіх знаходзяцца ў Чырвонай Арміі. Забіта жонка чырвонаармейца Кубецка Вера—24 год і яе дачка Рая — 4 год.

11-гадовы хлопчык Казлоў Мікола, які застаўся ў жывых, расказаў, што ён, хаваючыся ў лесе разам са сваёй маці Марыяй і аднавяскоўцамі ў ліку 48 чалавек, былі акружаны немцамі і трапілі ў рукі фашысцкіх катаў. Усіх акружаных старых, жанчын і дзяцей немцы расстрэльвалі ва ўпор, хто быў жывы—дабівалі прыкладамі. У ліку 48 чалавек загінула маці гэтага хлопчыка, сястра Жэня—9 год і брат Валя—9 месяцаў. Хлопчык застаўся ў жывых, дзякуючы таму, што ён у час расстрэлу ўпаў пад труп сваёй маці, дзе праляжаў да змроку. Пасля, апрытомнеўшы, ён блукаў 7 дзён па лясах, абмарозіўшы сабе ногі.

У вёсцы Задобрына, як устаноўлена з допыту насельніцтва, з 24 сем'яў засталіся ў жывых толькі тры сям'і.

Вышэйпамянёныя злачынствы фашысцкія забойцы праводзілі ў межах Суражскага і іншых раёнаў Віцебскай вобласці пад выглядам барацьбы з партызанамі Беларусі. Для гэтай мэты яны сабралі каля 6.000 чалавек—немцаў, паліцыі і так званай «добраахвотнай рускай арміі».

**Пад актам следуе 6 подпісаў.**

## АКТ

9 студзеня 1943 г., вёска Асавок, Бярэзінскага раёна, Мінскай вобласці.

Мы, ніжэйпадпісаныя, прадстаўнікі партызанскага атрада Міхаіл П. і Васіль З. і прадстаўнік комсамольскай арганізацыі Барысаўскага раёна Уладыслаў В. і калгаснік в. Асавок Аляксандр Р. склалі гэты акт аб нямецкіх зверствах у гэтай вёсцы.

Немцамі спалена 13 хат, забіта 43 чалавекі, з іх: мужчын—12, жанчын—18, дзяцей—13 (спіс забітых прыкладаецца).

Аб чым і складзены гэты акт.

**Міхаіл П., Васіль З., Уладыслаў В., Аляксандр Р.**

## СПІС ПА-ЗВЕРСКУ ЗАКАТАВАНЫХ І ЗАБІТЫХ НЕМЦАМІ ЖЫХАРОЎ ВЁСКІ АСАВОК

Савіч Мікалай Андрэевіч—48 год, Сімановіч Мікалай Фёдаравіч—52 год, Сімановіч Алесь Андрэевіч—33 год, Сімановіч Мікалай Алесеў—3 год, Сімановіч Зінаіда Алесева—5 год, Сімановіч Галя Алесева—7 год, Савіч Ксеня Ав.—45 год, Рабкевіч Пётр Язэпаў—50 год, Рабкевіч Марыя Яз.—41 года, Маркевіч Пётр Емельянавіч—47 год, Маркевіч Тэкля Гіляраўна—90 год, Маркевіч Валеры Іванавіч—7 год, Маркевіч Малашка Гіляраўна—63 год, Сімановіч Васіль Ахрэмаў—65 год, Сімановіч Марыя Васільеўна—28 год, Сімановіч Андрэй Несцеравіч—63 год, Сімановіч Анюта—35 год, Сімановіч Віктар Андрэевіч—2 год, Савіч Ольга Фёдараўна—21 года, Савіч Валенціна Ф.—30 год, Рабкевіч Марына—80 год, Рабкевіч Ігнась Кастусёў—54 год, Рабкевіч Цярэшка Аўласаў—70 год, Рабкевіч Кацярына—71 года, Рабкевіч Язэп Паўлавіч—33 год, Рабкевіч Ольга Васільеўна—25 год, Рабкевіч Зіна Юзява—3 год, Рабкевіч Ульяна—65 год, Рабкевіч Кацярына—45 год, Шавяка Зося Юлікава—25 год, Шавяка Адам Пятровіч—5 год. Шавяка Галя Пятроўна—3 год, Шавяка Ліда Юлікава—30 год, Шавяка Гэлька П.—4 год, Шавяка Валодзя—6 год, Несцяровіч Маня Аўхімаўна—28 год, Рабкевіч Васіль Цярэшкаў—36 год, Рабкевіч Васіліна—30 год, Рабкевіч Пётр Васільевіч—8 год, Рабкевіч Труніся В.—5 год, Рабкевіч Эдзік В.— 2 год, Рабкевіч Наталля—45 год, Маркевіч Наталля—46 год.

## АКТ

25 сакавіка 1943 г., в. Нізкія, Камароўскага сельсовета, Суражскага раёна.

Мы, ніжэйпадпісаныя, склалі гэты акт аб наступным:

У вёсцы Нізкія, Камароўскага сельсовета, Суражскага раёна, Віцебскай вобласці 15 сакавіка 1943 года гітлераўскія людаеды сагналі ў хлеў усіх мірных жыхароў і падпалілі яго. Некаторыя з калгаснікаў, як: Шапо Аляксандр Сямёнавіч—38 год з дачкой Галяй—11 год, Юдзін Спірыдон Пятровіч—60 год, вырваліся з ахопленага полымем хлява, але былі прыстрэлены. У ліку па-зверску спаленых: Чкубенка Васіль Еўдакімавіч—60 год, яго жонка Ірына—63 год, дачка Екацерына—17 год і 2 сыны—13 і 10 год; Кісялёва Уліта—60 год, яе дачка Анастасія—20 год.

Выходзячы з вёскі, гітлераўцы падпалілі яе.

Усяго было спалена 221 чалавек — жанчын, дзяцей і старых. Страшэнныя катаванні і здзекі ўчынілі немцы над стар-

шынёю калгаса «Большэвік» Аверчанкам Філіпам Еўдакімавічам, якому абрэзалі павекі, нанеслі некалькі нажавых ран, а пасля забілі.



Фашысцкія людаеды цешацца сваёй «работай»

Гітлераўцы гвалтоўна гоняць на катаржныя работы ўсё дарослае насельніцтва. Так, у калгасе імя 2-й пяцігодкі немцы сілай зброі выгналі ў г. Віцебск 9 дзяўчат. Уцёкшая з лагера Артамонава Екацерына Данілаўна расказала, што ўсе ўзятыя дзяўчаты пастаўлены на земляныя работы, шмат хто з іх памёр з голаду, бо хлеба даюць усяго па 100 грамаў у дзень. Яе сяброўак Кісялёву Еўдакію Захараўну і Сяргеенкаву Ефрасінню Ефімаўну адправілі ў дом распусты ў Германію.

**Подпісы: Партызаны—С., Н., З., Л.**
**Калгаснікі: Павел Ю., Емельян Е., Екацерына А.**

## З ДАНЯСЕННЯ КАМАНДЗІРА Н-СКАГА ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА

У сакавіку 1943 года нямецкія акупанты спалілі поўнасцю ўсе вёскі Асвейскага раёна Віцебскай області і знішчылі 3.639 чалавек мірных жыхароў раёна, у тым ліку: 2.118 чалавек дзіцячага ўзросту і 710 старых.



Трупы закатаваных і забітых немцамі савецкіх грамадзян вывозяцца на звалку.

Выгнана на катаржныя работы 2.615 чалавек.

Усім членам сям'і Юхновіча, аж да маленькага дзіцяці, фашысты выразалі зоркі на грудзях, а пасля іх кінулі жывымі ў агонь. Многім жыхарам гітлераўцы выкручвалі і адрывалі рукі, ногі, кідалі іх у раку Свольна.

Дзяўчат немцы згвалцілі, а потым забілі.

**Подпіс.**

19 красавіка 1943 года.



Бібліятэка

## ЗЛАЧЫНСТВЫ ФАШЫСТАЎ У МЕХАЎСКІМ РАЁНЕ

(Віцебская вобласць)

### АКТ

28 студзеня 1943 года, калгас імя Леніна, Газбенскага сельсовета, Мехаўскага раёна.

Мы, ніжэйпадпісаныя — старшыня Газбенскага сельсовета і калгаснікі Фама Я., Тарас С., Павел Л. склалі гэты акт аб наступным:

Нямецка-фашысцкімі акупантамі спалены ў калгасе імя Леніна: 2 хаты, хлеў і лазня гр-на Шавулкі Васіля, свіран і хлеў гр-на Анашкіна Міхаіла Маркавіча, хата і хлеў Русаковай Ульяны, хата і хлеў Анашкіна Аляксея, хата і 2 хлявы Ткачова Ягора Іванавіча, хата Сяргеенкі Ігната Арланавіча, 2 хлявы Базыкі Андрэя, хата і хлеў Шавулкі Якава, хата і хлеў Сяргеенкі Ціхона, хата і хлеў Ткачова Лукі, хата Сяргеенкі Аляксандра, хата і хлеў Яўсеева Антона, хата Ткачова Фёдара, хлеў і свіран Сяргеенкі Тараса, хата і 2 хлявы Русакова Арсенія, хата і хлеў Бабаева Мікалая, хата Панчанкі Ціта, хата, хлеў і лазня Ткачова Захара, хата, хлеў і лазня Ватчэнкі Васіля, хлеў і хата Крушнякова Сяргея, хата і хлеў Снігірова Кірылы, хата і хлеў Панчанкі Кірілы, хата і хлеў Себракова Івана, хата Стрыкатовай Анны, хата і хлеў Ткачова Антона, хата і хлеў Крушнякова (Сяргея) Мікалая, хата і 2 хлявы Уклія Філіпа, хата і хлеў Стрыкатава Андрэя, хата і хлеў Якушэвіч Елены, хата і хлеў Чыстага Аляксея, хлеў і хата Чыстага Маркі, хлеў і хата Кібіса Максіма, хлеў і хата Макаронак Еўдакіі, хлеў, хата і свіран Кібіса Змітра, хата і хлеў Якушэвіча Фамы, хлеў і хата Ермалаева Мікалая, хлеў Уклія Цімафея, хата і хлеў Стрыкатай Варвары, хлеў і хата Новікавай Екацярыны, хата і хлеў Банюшкі Афанасія, хата, хлеў і пуня Кібіса Мікалая, хата, хлеў і пуня Банюшкі Васіля, хата і хлеў Сюбаравай Усціны, хата і хлеў Лукаценка Івана, хата і хлеў Волкава Сямёна, хата, хлеў і свіран Новікава Мацвея, хлеў і свіран Парфененкі Андрэя, хата і хлеў Крушнякова Дзмітрыя, хлеў і хата Лукаценак Агаф'і, хата і хлеў Якушэвіч Мар'і, хлеў і хата Сюбарава Данілы, хата, свіран і хлеў Кібіса Ермалая, хлеў і хата Альшанікава Сямёна, 2 хлявы і хата Новікава Данілы, хлеў і хата Уклія Васіля,

2 свірны, хлеў і хата Клецко Івана, хата, хлеў і свіран Уклія Фамы, хата, хлеў і свіран Шмыкова Ягора.

Спалена калгасных будынкаў:

2 стайні, 8 хлявоў, 22 гумнаў, 7 такоў, 9 свірнаў.

**У чым і распісваемся:**

**Старшыня Газбенскага сельсовета (подпіс).**

**Калгаснікі (подпісы).**

## АКТ

18 снежня 1942 г., калгас «Чырвоны Араты», Межанскага сельсовета.

Мы, ніжэйпадпісаныя — старшыня калгаса Т., брыгадзіры Ф. і А. склалі гэты акт аб наступным:

За час акупацыі немцы ў калгасе зрабілі наступныя злачынствы:

Спалілі будынкаў грамадскага карыстання: хат—3, свірнаў—6, гумнаў—34, хлявоў—14.

Спалілі будынкаў калгаснікаў: хат—33, свірнаў—20, лазняў—14, хлявоў—33.

Забралі жывёлы 185 галоў, у тым ліку: кароў—111, авечак—55, свіней—14, коней—5. Забралі збожжа—23 тоны.

Забілі 9 чалавек калгаснікаў, з іх мужчын—2, жанчын—7, у тым ліку:

Загнетаў Антон Іванавіч, Загнетава Фядосся Васільеўна, Філімоненка Ольга Аляксандраўна, Філімоненка Пелагея Савельяўна, Загнетава Агаф'я Васільеўна, Дзятлоў Савелій Іванавіч, Гаравая Дар'я Якаўлеўна, Дышлеўская Васа Іванаўна, Лапушкіна Валенціна Герасімаўна.

Што і сцвярджаем:

**Подпісы (тры).**

## АКТ

22 студзеня 1943 года, Саладухінскі сельсовет.

Мы, ніжэйпадпісаныя — старшыня Саладухінскага сельсовета С. і партызан тав. З. у прысутнасці панятога Канстанціна С. склалі гэты акт аб наступным:

Немцамі спалены калгас «Чырвоны баец», Саладухінскага сельсовета. Згарэла: жылых будынкаў калгаснікаў—52, халодных будынкаў калгаснікаў—95, школа—1, клуб—1, халодных будынкаў калгаса—31, жылы дом калгаса—1.

**У чым і распісваемся:**

**Старшыня Саладухінскага сельсовета—С.**
**Партызан — З.**
**Паняты — Канстанцін С.**

## З АКТА

17 снежня 1942 г., калгас імя 8 сакавіка, Межанскага сельсовета.

Мы, старшыня калгаса імя 8 сакавіка Філіп А., брыгадзір калгаса Аляксандр П. і калгаснік Владзімір К. засведчылі наступныя злачынствы, якія ўчынілі немцы ў калгасе імя 8 сакавіка:

1. Спалена: млын—1, клуб—1, будынкаў каапэрацыі—6, пошта—1, бальнічных будынкаў—5, ільнозавод—1, жылых будынкаў сельсовета—10, школ—4, маслазавод—1, хлебапекарня—1, будынак сельсовета—1, будынкаў калгаса—16, будынкаў калгаснікаў—63, іншых халодных збудаванняў—120.
2. Забрана жывёлы грамадскай і ў калгаснікаў—335 галоў.
3. Забрана збожжа—10 тон.
4. Забіты Фірсава Марыя, Калакша Марыя і Калакша Валя.

**У чым і распісваемся:**

**Старшыня калгаса Філіп А.**
**Брыгадзір калгаса Аляксандр П.**
**Калгаснік Владзімір К.**

## З АКТА

18 снежня 1942 г., калгас «Уперад», Межанскага сельсовета.

Гэты акт складзены старшынёй калгаса «Уперад» Д. Е. і калгаснікамі М. Г. і Іван В.

За перыяд свайго гаспадарання ў калгасе «Уперад» нямецкія акупанты забралі: буйнай рагатай жывёлы—8 галоў, курэй—50, збожжа—50 цнт.

Забілі мужчын—2, дзяцей—1 (Шарубнева Сцяпана Н., Арлова Лявона М., Ваднёва Руслана).

**У чым і распісваемся: Д. Е., М. Г., Іван В.**

## З АКТА

30 кастрычніка 1942 г., калгас імя Калініна, Межанскага сельсовета, Мехаўскага раёна.

Мы, брыгадзір калгаса імя Калініна Р. Ф., рахункавод Н. К. і старшыня сельсовета А., сведчым гэтым актам, што германскія войскі 2 кастрычніка 1942 года, уварваўшыся ў брыгаду № 2 нашага калгаса, спалілі жылых хат калгаснікаў—53, хлявоў—80, свірнаў грамадскага карыстання—4, хлявоў грамадскага карыстання—7, гумнаў з кармамі—2, кузню—1, увесь немалочаны ячмень, авёс, яравое жыта, 20 тон сена і забралі жывёлы калгаснікаў: кароў—42, авечкі—129, свіней—12, курэй—200, гусей—15, качак—30.

**Тры подпісы.**

## АКТ

18 снежня 1942 года, калгас «Ударнік», Паташэнскага сельсовета, Мехаўскага раёна.

Я, старшыня Паташэнскага сельсовета, Мехаўскага раёна К. сумесна з калгаснікамі калгаса «Ударнік» В. і П. М. склалі гэты акт аб наступных злачынствах, якія ўчынілі нямецка-фашысцкія акупанты ў калгасе «Ударнік».

Спалена хат—46, халодных будынкаў—50, забіта калгаснікаў і калгасніц—10 чалавек.

**Старшыня сельсовета (подпіс).**
**Калгаснікі (подпісы).**

## АКТ

14 снежня 1942 года, калгас «Свабода», Межанскага сельсовета.

Мы, старшыня калгаса «Свабода» Міхаіл М. і калгаснік Антон К., склалі гэты акт у наступным:

Нямецкія акупанты ў нашым калгасе ўчынілі злачынствы:

1. Спалілі гумнаў з канюшынай—3, будынкаў грамадскіх—3, стайню—1, хлявоў—3, школу—1.
2. Забралі грамадскай жывёлы—28 галоў; жывёлы калгаснікаў: рагатай—133 галавы, авечак—186, коней—22.
3. Забралі збожжа 315 пудоў.
